# Чыгунка ў мастацка-вобразным спасціжэнні прасторы ў творах Якуба Коласа: асацыяцыі і паралелі

УДК 821.161.3.09(092)Колас



**Жанна ШАЛАДОНАВА,**
**кандыдат філалагічных навук**

Жанна ШАЛАДОНАВА. Чыгунка ў мастацка-вобразным спасціжэнні прасторы ў творах Якуба Коласа: асацыяцыі і паралелі. У артыкуле даследуюцца адметнасці ідэйна-эстэтычнага ўвасаблення вобраза чыгункі ў творах Якуба Коласа ва ўвязцы з мастацка-паэтычнай традыцыяй і светапогляднымі ўстаноўкамі эпохі ў асэнсаванні гэтай новай культурна-тэхнічнай з'явы. Раскрываецца сэнсавая поліфанія вобраза як метафарычная аналогія паскарэння жыцця, яго абнаўлення, рэвалюцыі і прагрэсу, таксама адаптацыі ў соцыуме, мэтанакіраванасці і самаідэнтыфікацыі чалавека.
Ключавыя словы: чыгунка, цягнік, нацыянальная прастора, паскарэнне, рэвалюцыя, прагрэс, псіхалагічны роздум, самаідэнтыфікацыя.

Zhanna SHALADONAVA. The railway in the artistic and imaginative comprehension of space in the works of Yakub Kolas: associations and parallels. The features of ideological and aesthetic image embodiment of the railway in the works of Yakub Kolas in connection with the artistic and poetic tradition and ideological attitudes of the epoch are examined in the article. The semantic polyphony of the image as a metaphorical analogy for the acceleration of life, its renewal, revolution and progress, as well as adaptation in society, the purposefulness and self-identification of a person is revealed.
Keywords: railway, train, national space, acceleration, revolution, progress, psychological reflection, self-identification.

Вобраз чыгункі ўваходзіў у літаратуру розных краін амаль адначасова са з'яўленнем гэтага камунікацыйна-тэхнічнага вынаходніцтва ў XIX стагоддзі. Яго літаратурна-мастацкая інтэрпрэтацыя з самага пачатку была дастаткова неадназначнай, звязвалася з адчуваннем пагрозы, абумоўленым натуральнай насцярожанасцю і кансерватызмам стаўлення чалавека да цывілізацыйных новаўвядзенняў, асабліва фактаў бесперапыннага паскарэння жыцця, змены яго звыклых рытмаў. Наступствы гэтых перамен бачыліся небяспечнымі і цяжка кантралюемымі, пакідалі жаданне спыніцца, адасобіцца, засяродзіцца на ўнутрана важным, на непераходных жыццёвых каштоўнасцях і сэнсах, прытрымлівацца традыцыйных правіл, звычак, тэмпаў. Але менавіта праз адчуванне і скіраванасць чыгуначнага руху адбывалася прыпадабненне гістарычнага развіцця тэхнічнаму, больш выразна і ўпэўнена акрэсліваліся вектары чалавечага жыцця, культуры і гісторыі.

У паэме Я. Коласа «Новая зямля» (1911–1923) пошукі галоўнымі героямі сваёй зямлі, свайго дому адлюстроўваюць ключавыя тэндэнцыі і светапоглядныя ўстаноўкі пераходнай эпохі пачатку XX стагоддзя. Сацыяльна-бытавая неўладкаванасць

## ПРА АЎТАРА

ШАЛАДОНАВА Жанна Сяргееўна.

Нарадзілася ў в. Сідараўка Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1992), аспірантуру Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі (1995). З 1996 года працавала на пасадзе малодшага навуковага супрацоўніка, з 2006 года – старшы навуковы супрацоўнік аддзела ўзаемасувязей літаратур Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі (з 2015 года – Інстытут літаратуразнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі).

Кандыдат філалагічных навук (1998).

Аўтар амаль 150 навуковых прац, сярод якіх дзве манаграфіі, шэсць раздзелаў у калектыўных манаграфіях, артыкулы ў навуковых зборніках, навукова-перыядычных выданнях.

Сфера навуковых інтарэсаў: кампаратывістыка, беларуская класіка ў кантэксце ўсходнеславянскіх літаратур, паэтыка прасторы.



**Будаўніцтва Лібава-Роменскай чыгункі. 1860-я гады**

і адсюль духоўная няўтульнасць жыцця герояў твора ўпісваюцца ў агульную парадыгму качэўніцтва, пазбаўленасці адчування грунту, дому, характэрную для гэтага перыяду. Драматызм прыватнай сітуацыі праецыруецца на лёс цэлага народа, яго блуканняў на дарогах гісторыі ў пошуках самаідэнтыфікацыі і самавызначэння. Гэта неўладкаванасць, трывога і ўнутраны неспакой, хісткасць жыццёвага становішча герояў абумоўлівае прысутнасць у іх жыццёвым лёсе чыгункі і вакзала:

Ўсё там кіпіць, бы ў час разрухі,
Снуюць служачыя, як мухі,
Гудуць, шумяць, бы ў вуллі пчолы,
І ходзяць шумна, балаголы… *[1, с. 240*]

Вобраз чыгункі ў рускай літаратурнай традыцыі, да якой Якуб Колас асабліва быў набліжаны ў пачатковы перыяд творчасці, сфарміраваў свой шэраг устойлівых ідэйна-сэнсавых канатацый, адлюстраваных у творах М. Някрасава, Ф. Дастаеўскага, Л. Талстога, В. Брусава, А. Блока. У аднайменнай паэме М. Някрасава чыгунка выступае як сімвал прыгнёту, пакут, цяжкай працы, нават смерці, звязанай з яе будаўніцтвам. Рускі паэт узняў вострую сацыяльную праблему, што ўсе праявы тэхнагеннай цывілізацыі, у тым ліку і чыгунка, ствараюцца ва ўмовах жорсткай эксплуатацыі. Шлях да будучыні і прагрэсу ў вершы прагнастычна звязваецца з выпрабаваннямі, шматлікімі народнымі ахвярамі *[2, с. 145]*.

З дапамогай вобразаў фабрык, заводаў, чыгункі, што азнаменавалі прыход капіталістычнай цывілізацыі, і беларускія паэты завастралі сацыяльную праблематыку, звярталі ўвагу на знявечанасць чалавека-працаўніка ў індустрыяльным грамадстве. Так, М. Багдановіч у вершы «Мяжы» (1914) падкрэсліў дысананс паміж умовамі і вынікамі працы чалавека, стваральніка цывілізацыйных даброт: // Ён рэйкі пралажыў чыгунак, / Заводаў коміны падняў у выш нябёс, А сам даўно сляпы ад слёз / І ўжо забыўся аб ратунак // *[3, с. 275]*.

Сімвалічна-ідэйную ролю вобраз чыгункі адыгрывае і ў мастацкай задуме паэмы «Новая зямля» Я. Коласа, якая пачыналася з вершаванага апавядання «Як дзядзька ездзіў у Вільню і што ён там бачыў», напісаным Якубам Коласам у 1911 годзе падчас знаходжання ў мінскім астрозе. На аснове апавядання пазней былі створаны паэмныя раздзелы «Па дарозе ў Вільню», «Дзядзька ў Вільні», «На Замкавай гары», у якіх расказваецца пра паездку Антося на цягніку ў Вільню падаць прашэнне ў зямельны банк. У шэрагу шматлікіх «дарог жыцця», якія давялося спазнаць героям паэмы і якія арганізуюць яе ідэйна-кампазіцыйную структуру, паездка Антося ўяўляла яшчэ адну па-свойму знакавую дарогу, з ёй звязваліся вялікія спадзяванні на станоўчае вырашэнне пытання аб набыцці зямлі.

Аўтарскі аповед пабудаваны такім чынам, што дэклараваны ў творы прыватны інтарэс асобнай сям'і, думкі, разлікі, мары герояў аб набыцці зямлі пэўным чынам карэлююць з больш шырокімі надзённымі пытаннямі і праблемамі нацыянальна-культурнага, сацыяльна-гістарычнага зместу, у тым ліку са спадзяваннямі і ўстаноўкамі, з якімі сялянства далучалася да рэвалюцыйных падзей 1905 і 1917 гадоў:

Няўжо то праўда, не вяроза?
Няўжо канец табе, пагроза,
І вечны ціск пад панскім ботам,
І страх знайсці канец пад плотам?
Няўжо то праўда, а не сненне
І мара йдзе ў ажыццяўленне?
Цяпер няма назад адходу!
Скідай з дарогі перашкоду,
Ні перад чым не запыняйся
І з гэтай спадчынай сквітайся,
Што асталося ад бацькоў –
Зямелькі некалькі шматкоў… *[1, с. 237]*

Падарожжа Антося на цягніку ў пэўнай меры ўяўляе вобразную алегорыю пераадолення народам гістарычных рубяжоў, пераходу з аграрна-патрыярхальнага грамадства ў новы індустрыяльны соцыум. Адчуванні і назіранні героя цесна звязаны з вызначальным аўтарскім роздумам пра будучы складаны лёс сялянства ў новы гістарычны перыяд пераўтварэнняў. Семантычнае напаўненне вобразаў цягніка і чыгункі ў мастацкай свядомасці пачатку XX стагоддзя фарміравалася ў тым ліку і пад уплывам вядомай метафары К. Маркса «рэвалюцыі – лакаматывы гісторыі».

Імклівы рух па зададзеных рэйках у прадвызначаным і нязменным кірунку выклікаў трывожныя асацыяцыі, прадчуванні набліжэння такіх жа імклівых і некантралюемых перамен з магчымымі катастрафічнымі вынікамі. У вершы «Чыгунка» (1908), паэме «Новая зямля» Я. Колас наследуе рускую фальклорную і літаратурную традыцыю выяўлення цягніка як змея (дракона), які нясе пагрозу, сумяціцу, хаос:




**Чыгуначны мост цераз Нёман у Гродне. Пачатак XX стагоддзя**

У гэты момант лютым змеем
Ляціць кур'ерскі. Задрыжалі
Усе шыбы ў вокнах на вакзале.
І ўвесь народ ураз мятнуўся *[1, с. 240–241]*.



Я. Кругер. Партрэт Якуба Коласа. 1923 год

У апісанні руху поезда беларускі паэт ужывае негатыўныя характарыстыкі, нарошчвае сувязі бяздушнай, механічнай «машыны» з істотамі хтанічнага свету:

Званок другі і зараз трэці,
І дрыгнуў поезд, быццам чэрці
Яго сярдзіта скаланулі,
Дождж цэлы іскр сыпанулі
І страшным рогатам заржалі
Ды з дымам далей паімчалі *[1, с. 241]*.

Падобную тэндэнцыю насцярожана-негатыўнага стаўлення да цывілізацыйнага абнаўлення, усведамлення несумяшчальнасці прыроднага і тэхнічнага пачаткаў выявіў Сяргей Ясенін у паэме «Сорокоуст» (1920). Увасабленнем варожай і пагібельнай для вясковай Расіі сілы з'явіўся «железной ноздрёй храпя, На лапах чугунный поезд» *[4, с. 83]*. Паэт прадчуў незваротнасць знікнення патрыярхальнай сялянскай Атлантыды як вынік неспрыяльных экалагічных, сацыяльных і духоўных наступстваў агрэсіўнага націску «сталевай конніцы»:

Скоро заморозь известью выбелит
Тот посёлок и эти луга.
Никуда вам не скрыться от гибели,
Никуда не уйти от врага.
Вот он, вот он с железным брюхом,
Тянет к глоткам равнин пятерню… *[4, с. 81–82]*

Майстры слова востра адчувалі дысананс паміж прыроднымі формамі жыцця і новымі з'явамі тэхнагеннай цывілізацыі, якія парушалі заведзены парадак, гарманічную ўсталяванасць, размеранасць натуральнага ходу рэчаў. Шум, гул, грукат і адчуванне хаосу прадвызначаюць спектр уражанняў і Антося на віленскім вакзале, што павялічвае яго негатыўныя канатацыі: «Як выйшаў дзядзька наш з вакзала, Яму аж моташна нейк стала: Такое пекла – шум страшэнны» *[1, с. 248]*. Расійскі даследчык С. Жыслін звярнуў увагу на спецыфічнасць абставін на перапоўненым вакзале і іх негатыўнае ўздзеянне на пачуцці: «незлічоны натоўп, тлум і таўкатня, абрыўкі размоў, воклікі, заклапочаныя твары, крыкі, званкі і гудкі, атмасфера прыспешвання, трывогі, узвінчвання – усё гэта адрознівае абставіны перапоўненага вакзала (часткова захаваныя і ў цягніку) ад любых іншых абставін у горадзе і вёсцы» *[ 5, с. 16]*.

Аднак сам прынцып хуткасці, імклівая экспрэсія руху, падчас якога асвойваецца, спасцігаецца «разгон і шыр» прасторы, прыўносяць адчуванне дынамічнага духоўнага развіцця, далучанасці да вялікага і насычанага жыцця радзімы, яркіх уражанняў падчас імгненнай змены яе каларытных сацыяльна-гістарычных і прыродна-культурных малюнкаў:

Прад ім раўніна рассцілалась
Палёў, засеяных хлябамі;
Загоны стройнымі радамі
Антосю вочы весялілі
І на працягу цэлай мілі
Узад пачціва адхадзілі
І расступаліс прад машынай *[1, с. 245]*.

Якуб Колас параўноўвае рух «машыны» з палётам «вольнай арліцы», успрымае яе як жывую, паступова выводзіць з дэманічнай прасторы ў вышыню паветра, вертыкаль. Гэты лёгкі і хуткі палёт сімвалізуе прагрэс, парыў, удасканаленне жыцця сучаснымі спосабамі перамяшчэння, увасабляе смелы рух, сілу, творчую энергію перадавой чалавечай думкі:

…як вольная арліца
Ляціць стралою, грозна дыша
І сівым дымам цяжка пыша *[1, с. 345]*.

Вобраз чыгункі ў паэме «Новая зямля» амбівалентны і адпавядае аўтарскаму бачанню гэтага тэхнічнага вынаходніцтва ў комплексе яго традыцыйна негатыўных характарыстык і адначасова абноўленай станоўчай цывілізацыйнай значнасці.

Тэма чыгункі, цягніка працягвала актыўна засвойвацца і развівацца ў беларускай літаратуры 1920-х гадоў, адпавядаючы ідэйным устаноўкам і лозунгам новага грамадства. У паэме У. Дубоўкі «Штурмуйце будучыні аванпосты» (1929) дзеянне разгортваецца ў цягніку, што «ідзе ад Оршы да Унечы». «І дым, і агонь, і туман», грукат колаў і лязганне рэсор напаўняюць дынамічны малюнак твора агрэсіўнымі праявамі і гукамі «жалезнага веку», што сведчаць пра напорыстае набліжэнне новай, тэхнакратычнай цывілізацыі. Цягнік бачыцца аўтару як унікальны сродак хуткаснага перамяшчэння, умовы і месца глыбокадумнага роздуму «пра лёсы краіны і долю», спасціжэння не толькі прасторы, але і часу, далучэння да маштабнага руху сусветнай гісторыі:

Імкнецца наперад цягнік,
у ноч і туманы ўбраны.
Наступныя й даўнія дні
разгортваюцца як з экрана.
У шэрагу розных падзей,
прыгожых і непрыгожых
на гэтым экране ідзе
сусвет у сваё падарожжа *[6, с. 309]*.

У размове Кандуктара, прамоўцы перамен, з Пасажырам, кансерватыўным і недаверлівым селянінам, агучваюцца розныя погляды на праблему калектывізацыі, рознае стаўленне да аграрнай палітыкі партыі. Вобразна-метафарычная напоўненасць вобразаў цягніка і чыгункі ў творы сугучная тагачасным тэндэнцыям выяўлення напружанай дынамікі сацыялістычнага будаўніцтва ў рускай літаратуры, ярка адлюстраваным у рэвалюцыйнай песні «Наш паровоз вперёд лети...» (1922), рамане В. Катаева «Время, вперед!» (1932) і іншых творах.

Рух цягніка ў паэме У. Дубоўкі таксама выступае эмблематычным увасабленнем новага грамадства, перадае экспансію рэвалюцыйных змен, якія натхнёна вітаюцца аўтарам, бачацца прагрэсіўнымі, адпаведнымі запатрабаванням і настроям часу: // Шумеце, грымеце няспынна / ў шляхах, / рэвалюцыі колы! // *[6, с. 350]*. Цягнік у мініяцюры перадае асновы справядлівага соцыума, у якім зняты класавыя адрозненні: «Суседзяць пад дахам адным сярмяга, жакетка і футра» *[6, с. 309]*.

Зусім іншыя правілы карыстання чыгункай адлюстраваны ў вершы А. Блока «На железной дороге» (1910). Аўтар адным штрыхом трапна зафіксаваў сацыяльнае расслаенне грамадства – пасажыры ездзяць у вагонах рознай катэгорыі: «Молчали желтые и синие; В зеленых плакали и пели» *[7, с. 313]*. З горкай іроніяй апісваў і Я. Колас паездку Антося на цягніку разам з іншымі «зайцамі» ў чорнай ад сажы, пылу і бруду «топцы». Паэт звярнуў увагу на той сумны факт, што стваральнікі цывілізацыйных даброт, людзі працы маглі дазволіць сабе карыстацца імі толькі ў скажона-прыніжанай форме: «Ядуць хлябок яны з мякінай, Зайцамі ездзяць на машыне» *[1, с. 246]*.

У трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» (1921–1954) супрацьстаянне чалавека, прыроды і «машыны» здымаецца і вобразы цягніка і чыгункі трансфармуюцца з чужародных, знешніх фактараў у прыкметныя, запатрабаваныя з'явы штодзённасці, далучаныя да жыццёвага руху і гармоніі. Якуб Колас перадае арганічнае спалучэнне ў адзінай сімфоніі жыцця механічных і прыродных форм у іх дасканаласці і харастве: «Аднатонную песню вялі колы вагонаў. Бясконцы рой залатых іскраў выпускаў паравоз, агністаю паласою вызначаючы сабе дарогу. Ціха гулі і судрыгаліся балоты побач



**На чыгуначнай станцыі. Пачатак XX стагоддзя**

чыгункі, дзе бегла машына. Раскаціста і гучна грымелі салаўі: звону іх песень не маглі заглушыць грук і шум вагонных колаў… Ізноў шуміць машына, ізноў заліваюцца салаўі» *[8, с. 185]*.

Метафара абнаўлення, памкнення да новых прагрэсіўных форм жыцця, чыгунка выступае своеасаблівай спадарожніцай на жыццёвым шляху Лабановіча, для якога дарога – вызначальны спосаб і стыль жыцця. Захоплены экспрэсіяй дзейснага руху, адпаведнага агульнай душэўнай настроенасці на перамены, настаўнік гэтак жа імкліва нарошчвае свае ўнутраныя рэзервы шляхам назапашвання жыццёвага вопыту, прагнага спасціжэння прастораў радзімы і адчування далучанасці да яе вялікага жыцця, асэнсавання яе прыгажосці і загадкавасці:

«Лабановіч стаяў каля расчыненага акна. Штосьці прыемнае і радаснае ўлівалася яму ў душу ад гэтых новых малюнкаў і ад гэтага размашыстага бегу машыны. Борзда адыходзіла назад станцыя з высокаю вадакачкаю, закрываючыся свежаю зеленню раслін. Рассыпаючы сноп залатых стрэл, велічна выплывала сонца з-за краю зямлі над прасторамі зялёнага палескага мора. Хутка вынікалі і беглі ўсё новыя і новыя малюнкі гэтага зачараванага краю…» *[8, с. 169]*.

Шматгранны матыў дарогі і чыгункі, выяўлены ў трылогіі Якуба Коласа, дазваляе падкрэсліць някідкую, але адметную прыгажосць родных краявідаў, панарамна адлюстраваць стыхію нацыянальнага жыцця, завастрыць вузлавыя моманты народна-гістарычнага лёсу і сацыяльных узаемаадносін, разгарнуць шырокі праблемна-роздумны спектр уражанняў і перажыванняў.

Чыгунка настройвае Лабановіча на роздум, самазаглыбленне і самааналіз. Імклівы «рух у стане спакою» абуджае псіхалагічныя перажыванні, вымушае па-новаму прыслухоўвацца да ўнутранага голасу і ў грукаце колаў пачуць глыбока асабістае, выявіўшы падсвядомую рэакцыю на мінулыя падзеі: «Дружна грукацелі колы. Іх грук зліваўся часамі ў нейкія дзіўныя спевы, і варта было падабраць словы, каб колы зараз жа выстукалі матыў да іх. Або наадварот: часамі матыў выклікаў словы… Лабановіч хацеў і не чуць іх, а яны ўпарта лезлі ў вушы: «Уцякай! Уцякай! Уцякай!» Каму казалі гэта колы: сабе ці яму?..» *[8, с. 195]*.

З вобразам чыгункі звязваюцца і выпрабаванні, якія выпадаюць на долю настаўніка, пошукі ім самога сябе, свайго шчасця і сэнсу жыцця. Увогуле, дарога, у тым ліку і чыгунка, непазбежна схіляе да роздумнасці, самарэфлексіі, чым узмацняе духоўна-эмацыянальнае, этычнае вымярэнне раманнай прасторы: «Дарога – вялікая яна ці малая – кожны раз хвалявала Лабановіча і настройвала яго мыслі і пачуцці на салодка-журботны лад. Месца, якое ён пакідаў і з якім ужо

звыкся, паўставала ў іншым святле і афарбоўцы, і тое, чаго ён раней як бы не заўважаў, станавілася дарагім і блізкім і з ім шкада было разлучацца» *[8, с. 478]*.

Пераезды героя, безумоўна, азначаюць нашмат больш, чым змену месцазнаходжання і працы. Адпавядаючы ўнутранаму рамантычнаму свету маладога настаўніка, чыгунка адлюстроўвае вехі яго асобаснага і прафесійнага развіцця і сталення, этапнасць абнаўлення, натхнёна-ўзнёслае чаканне новага, прадчуванне і жаданне перамен:

«Поезд зрушыўся з месца і пашыбаваў далей, набіраючы скорасць і пакідаючы за сабой густыя клубкі дыму. Лабановіч пастаяў з хвіліну, праводзячы вачамі поезд, завёзшы яго ў гэты ціхі куток, дзе пачынаецца новае жыццё. Прамільгнула думка, што знікшы на павароце чыгункі поезд паклаў сабою рубеж паміж тым, што было раней, і тым, што было наперадзе» *[8, с. 391]*.

Знешні імклівы рух цягніка карэлюе з ўнутраным паскарэннем. Поўны жыццёвых сіл, жаданняў, задум, Лабановіч знаходзіцца ў стане рашучага і напорыстага ўнутранага духоўна-маральнага руху да пастаўленых мэт. Дождж, навальніца, што напаткалі настаўніка на станцыі, успрымаюцца не толькі прадвеснікамі нарастаючых рэвалюцыйна-гістарычных змен у грамадстве, але і сімвалізуюць лёсаноснае *зліццё* героя з пачуццём дарогі, далучэнне да шырокай і імклівай *плыні* жыцця, пераадоленне ў ім коснасці і застою, імкненне да *абнаўлення*:

«Якраз прыбыў і поезд, выплыўшы, нібы з туману, з густой сеткі дажджу. Лабановіч выбег на платформу і ўскочыў у першы пасажырскі вагон. Хоць ён зараз і вымак, але быў вясёлы і задаволены. Нават прыгадалася народная прымета: калі выпраўляешся ў дарогу і цябе намочыць дождж, дык гэта к прыбытку, к дабру … Добра быць у дарозе, якую ты сам сабе выбіраеш!» *[8, с. 481]*.

Такім чынам, эвалюцыя пnative прасторавага вобраза чыгункі рэалізоўвалася Якубам Коласам у рэчышчы ключавых тэндэнцый літаратурнага асваення гэтага на той час новага вобраза, адпаведных светапоглядным установкам эпохі і семантычнай знакавасці дарожнага топаса. Вобраз чыгункі ў мастацкай інтэрпрэтацыі беларускага класіка захоўвае і развівае сутнасныя семантычныя аспекты дарогі як скіраванасці і сэнсу жыцця, *яго паскарэння*, імкнення *хутчэй* уліцца ў яго плыні дзеля пашырэння ўнутрана-духоўных даляглядаў, *дынамічнага* панарамнага спасціжэння нацыянальнай прасторы і самаідэнтыфікацыі чалавека. Коласаўскія тэндэнцыі выяўлення топаса чыгункі арыгінальна і шматпланава разгорнуты ў мастацкіх палотнах беларускай літаратуры, творах М. Лынькова, Хв. Шынклера, І. Навуменкі і іншых пісьменнікаў.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 17.03.2021 г.*

*Ілюстрацыі да артыкула скарыстаны з выдання «История белорусской железной дороги. Из XIX века – в век XXI [В.В. Яновская и др.] – Минск: Мастацкая літаратура, 2012. – 958 с.; з сайта «Белорусская железная дорога» https://history.rw.by*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Колас, Я. Збор твораў у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1972–1978. – Т. 6: Паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка». – 1974. – 624 с.
2. Некрасов, Н. А. Собрание сочинений: в 4 т. / Н. А. Некрасов. – М.: Современник, 1990. – Т. 2: Стихотворения и поэмы 1861–1874. – 637 с.
3. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 751 с.
4. Есенин, С. Полное собрание сочинений: в 7 т. / С. Есенин. – Изд. 2-е. – М.: ИМЛИ РАН, 2004–2005. – Т. 2: Стихотворения (Маленькие поэмы). – 2004. – 463 с.
5. Емелин, В., Тхостов, А. Деформация хронотопа в условиях социокультурного ускорения / В. Емелин, А. Тхостов // Вопросы философии. – 2015. – № 2. – С. 14–24.
6. Дубоўка, У. Збор твораў у 2 т. / У. Дубоўка. – Мінск : Лімарыус, 2017. – Том 1: Вершы. Паэмы. Пераклады. – 484 с.
7. Блок, А. Стихотворения. Поэмы / А. Блок. – М.: Дрофа: Вече, 2004.– 413 с.
8. Колас, Я. Збор твораў у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1972–1978. – Т. 9: Трылогія «На ростанях». – 1975. – 800 с.